SEX=БАЛЯСЫ

# У КОЖНАГА СВОЙ РЫА

**Адгучалі апошнія акорды Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанейра, крыху суцішыліся эмоцыі... Аднак нядаўнія падзеі па-ранейшаму на слыху. Нехта згадвае найперш рэкорды і пераможцаў. У кагосьці настрой дагэтуль азмрочаны допінгавымі скандаламі і правальнымі выступленнямі. («Каментатар: «Наша зборная ўпэўнена гуляе ў сваю гульню... А трэба было б у футбол...»). У любым выпадку ўсе мы былі і застаёмся датычнымі да Алімпіяды, няхай сабе і большасць — толькі ў якасці гледачоў і балельшчыкаў. («Калі наш чалавек набывае спартыўны касцюм, ён або збіраецца на прыроду, або кладзецца ў бальніцу»). Спартыўныя спаборніцтвы — заўсёды відовішчны занятак. Натрэніраваныя целы, моцная харызма патэнцыяльных пераможцаў невыпадкова ва ўсе часы надавалі атлетам яшчэ і сексуальнасці. Што казаць, у старажытнасці спартсмены выступалі ўвогуле аголенымі. Сучасныя тэхналогіі ў экіпіроўцы, у форме — у барацьбе за кожную секунду, кожны сантыметр — таксама надаюць знешняму выгляду атлетаў пэўную прывабнасць. А часам, наадварот, могуць сыграць са спартсменамі злы жарт. Ды і самі алімпійцы... Нехта заслужана застанецца ў нашай памяці дзякуючы сваім рэкордам. А камусьці гульні таксама падарылі хвіліну славы, але зусім з іншай нагоды...**

Яшчэ да пачатку Алімпіяды ў Рыа ў сецівe гулялі фотаздымкі мужчын-плыўцоў, абмазаных з ног да галавы пенкай для галення. І наступныя — з канчатковым вынікам пасля працэдуры. («Ты чаго не голішся?» — «Няма ў мяне дзяўчыны, для якой хацелася б пагаліцца...» — «А для сябе?» — «А для сябе я піва куплю».) У лёгкай атлетыцы і плаванні ўсё вырашаюць сотыя долі секунды. Для перамогі даводзіцца пазбаўляцца не толькі ад лішніх кілаграмаў, але і ад валасоў на целе. У прынцыпе, ніякай навіны тут не было: голяцца як мужчыны, так і жанчыны ўжо даўно. Папулярнасць здымкі набылі дзякуючы крыху з'едлівым каментарыям, маўляў, чэмпіёны таксама плачуць, калі робяць дэпіляцыю.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Далей, ужо падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця Алімпіяды, стадыён і сацыяльныя сеткі «парваў» спартсмен з Каралеўства Тога, які нёс сцяг сваёй краіны. Таэквандыст з рэльефнай мускулатурай выйшаў перад гледачамі і ўдзельнікамі іншых камандаў у самым арыгінальным, як яго тут жа назвалі, касцюме. Атлет быў у нацыянальнай цыноўцы, якая нагадвае спадніцу і... усё. Торс спартсмена быў абмазаны масажным алеем, што таксама парадзіла жарты. «Уніформа — масажны алей, проста масажны алей», — пісалі ў сецівe. Што ж, такі касцюм мог дазволіць сабе толькі жыхар астравоў з цёплым кліматам. (На курорце. «Дзяўчына, а пойдзем ноччу голымі купацца?» — «Вой, а я плаваць не ўмею». — «А мы і не будзем!») Дарэчы, члены нашай каманды ва ўніформе з элементамі нацыянальнага арнаменту таксама выглядалі сексуальна...

Затым быў кур'ёзны выпадак з японскім скакуном з шастом. Ну, для журналістаў і зноў жа карыстальнікаў сацыяльных сетак. Сам спартсмен напачатку пакрыўдзіўся, хоць потым сказаў, што ўспрыняў сітуацыю з гумарам. Атлет, як вырашылі некаторыя, не прайшоў у фінальную частку алімпійскіх спаборніцтваў быццам бы з-за таго, што падчас скачка збіў планку сваім... прычынным месцам у «заведзеным» стане. («Мама, чаму ты не пастукала перад тым, як увайсці ў мой пакой?» — «Праз замочную шчыліну было відаць, што зараз можна ўвайсці і без стуку».) Праўда, потым спартыўны эксперт патлумачыў, што такое ўражанне магло скласціся праз няўдалы ракурс здымак, насамрэч атлет збіў планку нагой і рукой. Скажыце, ці запомніўся б гэты алімпіец, каб не гэты трагікамічны выпадак? («Ніколі не гавары: «Я памыліўся». Лепш казаць: «Трэба ж, як цікава атрымалася!»)

Былі, на жаль, і іншыя выпадкі на гульнях... «П'едэстал гонару» ў спаборніцтвах па бегу занялі цемнаскурыя «жанчыны» з Паўднёвай Афрыкі, Бурундзі і Кеніі. Чаму словы ў двукоссях? Карыстальнікі сеціва адкрыта назвалі «атлетаў» гэтага забегу «мутантамі, жудасным відовішчам». («Як ты мог пераспаць з Наташкай? Яна ж страшная!» — «І дужая...») Карацей кажучы, і па знешнім выглядзе, і па выніках гэта хутчэй мужчыны. Прадстаўнік НАК Беларусі падзякаваў нашай спартсменцы ў бегу на 800 метраў за яе сёмы вынік менавіта з гэтай прычыны. «Не стану аспрэчваць рашэнне Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі, але, калі хочаце прадаставіць такім людзям магчымасць выступаць, стварыце трэцюю катэгорыю», — сказаў ён. Шкада, што такія відавочныя рэчы нехта не хоча разумець. («Спрачацца з трэнерам па барацьбе можа толькі трэнер па стральбе».)

...Што і гаварыць, спартсмены з нас далёка не ўсе. Як і атлетычная фігура далёка не ў кожнага. («Самы распаўсюджаны від плавання — пакрысе заплываць тлушчам».) І менавіта спартыўныя тэлеперадачы, у тым ліку і трансляцыі з Алімпійскіх гульняў, дазваляюць многім называць сябе балельшчыкамі. Ну так, бывае, што і пад піва з чыпсамі ідуць такія прагляды, і жывоцікі ў аматараў таго ці іншага віду спорту пасля адпаведныя... («Скажы, ты можаш падняць сто кілаграмаў?» — «Ну я ж неяк ранкам устаю з ложка!») Але, назіраючы за баталіямі на экране, нехта, магчыма, не-не ды і крытычна ацэньваў сваю ўласную фігуру. А потым, глядзіш, і фізічнымі практыкаваннямі пачаў займацца. Не для рэкордаў, а для тонусу і прыгажосці цела. У кожнага свая Алімпіяда і свая барацьба за ўзнагароды...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# Танцы, сонца, рок-н-рол з беларускім акцэнтам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— І як беларуская публіка ўспрымае музыку?***

— Прыязна. Але калі мы спрабуем зладзіць сольныя канцэрты, то людзей шмат сабраць не атрымліваецца. Калі ж іграем з іншымі гуртамі, то канцэрты маюць поспех, асабліва пры ўмове бясплатнага ўваходу. Прыходзіць многа слухачоў, нас хваляць, што выступаем вельмі прафесіянальна. Гэта прыемна. Маем і сваю публіку.

***— Канкурэнцыя вялікая?***

— Не. Цяпер папулярная крыху іншая музыка. Мне вельмі падабаецца The Silicon з-за чысціні жанру. Выдатна, калі музыканты прытрымліваюцца аднаго стылю, а не спрабуюць іх змешваць, каб прыцягнуць больш увагі, напрыклад, іграюць рок-н-рол з дыджэямі, сумяшчаючы песні з моднымі рытмамі.

**«Цікава, што ў Мінску сёрф-рок пачалі іграць яшчэ ў савецкія часы. Тут існаваў гурт «Алгарытмы», а ў 1968 годзе праходзіў фестываль біт-ансамбляў, падчас якога гучаў і сёрф».**

***— Ці можна цябе назваць кансерватарам у музыцы?***

— Так. Калі пачынаеш эксперыментаваць, вельмі хутка разумееш, што ўсё даўно прыдумана. На жаль. Я люблю, калі ў кампазіцыі ёсць дакладная мелодыя, стыль. Гэта не зусім кансерватызм, я прымаю эксперыменты, але блюз павінен заставацца блюзам, рок-н-рол — рок-н-ролам. Хоць цяпер усё — рок-н-рол: і Элвіс Прэслі, і гурт «Чайф».

***— Кампазіцыі The Silicon у большасці выпадкаў інструментальныя, без слоў. Ці хутка з'явіцца вакал?***

— Ён ужо ёсць! Паступова складваецца так, што палова выступлення — інструментальныя кампазіцыі, а палова — вакальныя. Адνымі інструментальнымі рэчамі вельмі складана трымаць публіку. Таму даводзіцца спяваць, і мы ўжо навучыліся.

***— Сёрф, напэўна, адзіны стыль, дзе прыкметай якасці лічыцца добрае выкананне кавераў на класіку жанру. Гэта сапраўды так?***

— У новым альбоме ўсе кампазіцыі нашы, а ў першым, Desert Storm, сапраўды было некалькі кавераў. Але ж і яны розныя бываюць. Я лічу, што калі песні споўнілася больш за 30 гадоў і ты іграеш яе ў стылі 1960-х, то гэта даніна павагі той музыцы, знак, што яе не забываюць. Проста даеш ёй новае жыццё.

***— А як крытыкі ўспрынялі ваш веснавы цалкам інструментальны альбом Tiki Tohua?***

— Мы адпраўлялі яго за мяжу, на радыёстанцыі, якія транслююць музыку 1950-1960-х гадоў, у Іспанію, Штаты. Там яго вельмі добра прынялі, а кампазіцыя Mysterious Island доўгі час знаходзілася на другім месцы ў хіт-парадзе, яе часта давалі ў эфір, былі станоўчыя водгукі. За мяжой музыка ў стылі сёрф больш распаўсюджаная. У нас жа крытыкі сказалі: сёрф і сёрф. Іншага мы і не чакалі. Няма з кім параўноўваць... Дзіўна, калі нас пачынаюць ацэньваць на адным узроўні з гуртамі Navi або Shuma — мы ж іграем абсалютна розную музыку.



***— Зразумела, што пад сёрф трэба танцаваць. А для чаго яшчэ падыходзіць такая музыка?***

— Ды для чаго заўгодна. Можна ехаць на машыне і слухаць, у кватэры прыбіраць, проста гуляць па вуліцах. Я люблю пад сёрф ездзіць на скейтбордзе, сноўбордзе.

***— Ты яшчэ іграеш на гітары ў гурце «Петля пристрастия», гэта каманда з зусім іншым стылем. Не складана пераключацца?***

— Не, бо ў тым гурце я не выступаю як аўтар музыкі, толькі як аранжыроўшчык. Асноўны генератар ідэй — вакаліст Ілья Чарапко, астатнія музыканты проста прапрацоўваюць яго задумкі. Мне вельмі падабаецца іграць там. Калектыў добры. Мы разам аб'ездзілі шмат гарадоў і ні разу не пасварыліся. Гэта выдатна.



***— Паслухаць The Silicon можна толькі ў Мінску?***

— З прэзентацыяй нашага новага альбома мы ездзілі ў Маскву і Піцер. Не так даўно вярнуліся са Смаленска. У нас і там ёсць свая аўдыторыя. Сёрф-музыканты з Піцера і Масквы ведаюць нас, лічаць нядрэннай камандай.

**«Сёрф-рок зарадзіўся і развіўся ў Каліфорніі, ЗША ў канцы 1950-1960-х гадоў, а каралём стылю лічыцца гітарыст Дзік Дэйл, які, дарэчы, мае беларускія карані».**

***— Як сябе рэкламуеце, каб арганізатары канцэртаў імкнуліся запрасіць менавіта вашу каманду?***

— Ды асаблівага піяру няма. У Мінску нас і так усе ўжо ведаюць *(смяецца)*. На жаль, у Беларусі музыкант павінен быць і рэкламшчыкам, і гукарэжысёрам, і сам сабе ладзіць канцэрт, нават квіткі прадаваць. Сапраўды, цяпер вельмі складаны час. У нашы дні можна хутка навучыцца іграць, якасныя інструменты даступныя, таму і канкурэнцыя вялікая. Раней у людзей было больш ідэй, а рэалізаваць іх тэхнічна было складаней. Цяпер наадварот: тэхнічна ўсё даступнае, а ідэі некуды зніклі, усе гурты адзін да аднаго падобныя. Да таго ж у нас у краіне рынак вельмі маленькі. Нават вядомыя выканаўцы не могуць часта выступаць, збіраць вялікія клубы. Толькі раз на тры-чатыры месяцы, часцей няма сэнсу, бо аўдыторыя вельмі абмежаваная па колькасці, так часта ніхто не будзе хадзіць на канцэрты. Мне ж як музыканту хочацца выступаць часта.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 31.08.2016 г.